ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 42 (901) | Субота, 18 кастрычніка 1952 года | Цана 50 кап.

Пад сцягам партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна — уперад, да перамогі комунізма!

XIX з'езд Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)

Прамова таварыша І. В. СТАЛІНА

(Паяўленне на трыбуне таварыша Сталіна дэлегаты сустракаюць бурнымі, доўга не змаўкаючымі апладысментамі, якія пераходзяць у авацыю. Усе ўстаюць. Воклічы: «Таварышу Сталіну — ура!», «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Слава вялікаму Сталіну!»).

Таварышы!

Дазвольце выказаць падзяку ад імя нашага з'езда ўсім брацкім партыям і групам, прадстаўнікі якіх выказалі пашану нашаму з'езду сваёй прысутнасцю або якія прыслалі з'езду прывітальныя звароты,—за дружаскія прывітанні, за пажаданні поспехаў, за давер'е. **(Бурныя, працяглыя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю).**

Для нас асабліва каштоўна гэтае давер'е, якое азначае гатоўнасць падтрымаць нашу партыю ў яе барацьбе за светлую будучыню народаў, у яе барацьбе супраць вайны, у яе барацьбе за захаванне міру. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Было-б памылкова думаць, што наша партыя, якая стала магутнай сілай, не мае патрэбы больш у падтрымцы. Гэта няправільна. Наша партыя і наша краіна заўсёды мелі патрэбу і будуць мець патрэбу ў давер'і, у спачуванні і ў падтрымцы брацкіх народаў за рубяжом.

Асаблівасць гэтай падтрымкі заключаецца ў тым, што ўсякая падтрымка міралюбівых імкненняў нашай партыі з боку любой брацкай партыі азначае разам з тым падтрымку свайго ўласнага народа ў яго барацьбе за захаванне міру. Калі англійскія рабочыя ў 1918—1919 гадах, у час узброенага нападу англійскай буржуазіі на Совецкі Саюз арганізавалі барацьбу супраць вайны пад лозунгам «Рукі прэч ад Расіі», то гэта была падтрымка, падтрымка перш за ўсё барацьбы свайго народа за мір, а потым і падтрымка Совецкага Саюза. Калі таварыш Тарэз або таварыш Тальяці заяўляюць, што іх народы не будуць ваяваць супраць народаў Совецкага Саюза **(бурныя апладысменты)**, то гэта ёсць падтрымка, перш за ўсё падтрымка рабочых і сялян Францыі і Італіі, якія змагаюцца за мір, а потым і падтрымка міралюбівых імкненняў Совецкага Саюза. Гэтая асаблівасць узаемнай падтрымкі тлумачыцца тым, што інтарэсы нашай партыі не толькі не супярэчаць, а, наадварот, зліваюцца з інтарэсамі міралюбівых народаў. **(Бурныя апладысменты).** Што-ж датычыць Совецкага Саюза, то яго інтарэсы наогул неаддзялімы ад справы міру ва ўсім свеце.

Зразумела, што наша партыя не можа заставацца ў даўгу ў брацкіх партый і яна сама павінна ў сваю чаргу аказваць ім падтрымку, а таксама іх народам у іх барацьбе за вызваленне, у іх барацьбе за захаванне міру. Як вядома, яна іменна так і робіць. **(Бурныя апладысменты).** Пасля ўзяцця ўлады нашай партыяй у 1917 годзе і пасля таго, як партыя прадпрыняла рэальныя меры па ліквідацыі капіталістычнага і памешчыцкага прыгнёту, прадстаўнікі брацкіх партый, захапляючыся адвагай і поспехамі нашай партыі, прысвоілі ёй званне «Ударнай брыгады» сусветнага рэволюцыйнага і рабочага руху. Гэтым яны выражалі надзею, што поспехі «Ударнай брыгады» аблегчаць становішча народам, пакутуючым пад прыгнётам капіталізма. Я думаю, што наша партыя апраўдала гэтыя надзеі, асабліва ў перыяд другой сусветнай вайны, калі Совецкі Саюз, разграміўшы нямецкую і японскую фашысцкую тыранію, выратаваў народы Еўропы і Азіі ад пагрозы фашысцкага рабства. **(Бурныя апладысменты).**

Вядома, вельмі цяжка было выконваць гэтую пачэсную ролю, пакуль «Ударная брыгада» была адна-адзіная і пакуль прыходзілася ёй выконваць гэтую перадавую ролю амаль у адзіноцтве. Але гэта было. Цяпер — зусім іншая справа. Цяпер, калі ад Кітая і Карэі да Чэхаславакіі і Венгрыі паявіліся новыя «Ударныя брыгады» ў асобе народна-дэмакратычных краін, — цяпер нашай партыі лягчэй стала змагацца, ды і работа пайшла весялей. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Асаблівай увагі заслугоўваюць тыя комуністычныя, дэмакратычныя або рабоча-сялянскія партыі, якія яшчэ не прышлі да ўлады і якія прадаўжаюць працаваць пад пятой буржуазных драконаўскіх законаў. Ім, зразумела, больш цяжка працаваць. Аднак ім не так цяжка працаваць, як было цяжка нам, рускім комуністам, у перыяд царызма, калі малейшы рух уперад аб'яўляўся найцяжэйшым злачынствам. Аднак рускія комуністы выстаялі, не спалохаліся цяжкасцей і дабіліся перамогі. Тое-ж самае будзе з гэтымі партыямі.

Чаму ўсё-ж не так цяжка будзе працаваць гэтым партыям у параўнанні з рускімі комуністамі царскага перыяду?

Таму, па-першае, што яны маюць перад вачыма такія прыклады барацьбы і поспехаў, якія ёсць у Совецкім Саюзе і народна-дэмакратычных краінах. Значыцца, яны могуць вучыцца на памылках і поспехах гэтых краін і тым аблягчыць сваю работу.

Таму, па-другое, што сама буржуазія, — галоўны вораг вызваленчага руху, — стала іншай, змянілася сур'ёзным чынам, стала больш рэакцыйнай, страціла сувязі з народам і тым аслабіла сябе. Зразумела, што гэтая акалічнасць павінна таксама аблягчыць работу рэволюцыйных і дэмакратычных партый. **(Бурныя апладысменты).**

Раней буржуазія дазваляла сабе ліберальнічаць, адстойвала буржуазна-дэмакратычныя свабоды і тым стварала сабе папулярнасць у народзе. Цяпер ад лібералізма не засталося і следу. Няма больш так званай «свабоды асобы», — правы асобы прызнаюцца цяпер толькі за тымі, у якіх ёсць капітал, а ўсе іншыя грамадзяне лічацца сырым чалавечым матэрыялам, прыгодным толькі для эксплуатацыі. Растаптан прынцып раўнапраўя людзей і нацый, ён заменен прынцыпам паўнапраўя эксплуататарскай меншасці і бяспраўя эксплуатуемай большасці грамадзян. Сцяг буржуазна-дэмакратычных свабод выкінут за борт. Я думаю, што гэты сцяг прыдзецца ўзняць вам, прадстаўнікам комуністычных і дэмакратычных партый, і панесці яго ўперад, калі хочаце сабраць вакол сябе большасць народа. Больш няма каму яго ўзняць. **(Бурныя апладысменты).**

Раней буржуазія лічылася главой нацыі, яна адстойвала правы і незалежнасць нацыі, ставячы іх «вышэй за ўсё». Цяпер не засталося і следу ад «нацыянальнага прынцыпу». Цяпер буржуазія прадае правы і незалежнасць нацыі за далары. Сцяг нацыянальнай незалежнасці і нацыянальнага суверэнітэту выкінут за борт. Няма сумнення, што гэты сцяг прыдзецца ўзняць вам, прадстаўнікам комуністычных і дэмакратычных партый, і панесці яго ўперад, калі хочаце быць патрыётамі сваёй краіны, калі хочаце стаць кіруючай сілай нацыі. Яго няма каму больш узняць. **(Бурныя апладысменты).**

Так абстаіць справа ў сучасны момант.

Зразумела, што ўсе гэтыя акалічнасці павінны аблягчыць работу комуністычных і дэмакратычных партый, якія не прышлі яшчэ да ўлады.

Значыцца, ёсць усе падставы разлічваць на поспехі і перамогу брацкіх партый у краінах панавання капітала. **(Бурныя апладысменты).**

Няхай жывуць нашы брацкія партыі! **(Працяглыя апладысменты).**

Няхай жывуць і здраўствуюць кіраўнікі брацкіх партый! **(Працяглыя апладысменты).**

Няхай жыве мір паміж народамі! **(Працяглыя апладысменты).**

Далоў падпальшчыкаў вайны! **(Усе ўстаюць. Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю. Воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Таварышу Сталіну ура!», «Няхай жыве вялікі правадыр працоўных свету таварыш Сталін!», «Вялікаму Сталіну ура!», «Няхай жыве мір паміж народамі!». Воклічы: «ура»).**

Выбранне Пленумам Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай Партыі Совецкага Саюза выканаўчых органаў ЦК

16 кастрычніка 1952 года адбыўся Пленум уноў выбранага Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай Партыі Совецкага Саюза.

1) Пленум выбраў **Прэзідыум ЦК** у наступным саставе: тт. **Сталін І. В., Андрыянаў В. М., Арыстаў А. Б., Берыя Л. П., Булганін Н. А., Варашылаў К. Е., Ігнацьеў С. Д., Кагановіч Л. М., Каротчэнка Д. С., Кузнецоў В. В., Куусінен О. В., Маленкоў Г. М., Малышэў В. А., Мельнікаў Л. Г., Мікаян А. І., Міхайлаў Н. А., Молатаў В. М., Первухін М. Г., Панамарэнка П. К., Сабураў М. З., Суслаў М. А., Хрушчоў Н. С., Чэснакоў Д. І., Швернік Н. М., Шкіратаў М. Ф.**

Кандыдаты ў члены Прэзідыума: тт. **Брэжнеў Л. І., Вышынскі А. Я., Зверэў А. Г., Ігнатаў Н. Г., Кабанаў І. Г., Касыгін А. Н., Патолічаў Н. С., Пегаў Н. М., Пузанаў А. М., Тевасян І. Ф., Юдзін П. Ф.**

2) Пленум выбраў **Сакратарыят ЦК** у наступным саставе: тт. **Сталін І. В., Арыстаў А. Б., Брэжнеў Л. І., Ігнатаў Н. Г., Маленкоў Г. М., Міхайлаў Н. А., Пегаў Н. М., Панамарэнка П. К., Суслаў М. А., Хрушчоў Н. С.**

3) Пленум ЦК зацвердзіў старшынёй Камітэта Партыйнага Кантролю пры ЦК КПСС тав. **Шкіратава М. Ф.**

У Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі

16 кастрычніка 1952 года адбылося паседжанне Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі Комуністычнай Партыі Совецкага Саюза.

Цэнтральная Рэвізійная Камісія выбрала старшынёй Камісіі тав. **Маскатава П. Г.**

XIX з'езд Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)

Састаў Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза, выбранага XIX з'ездам партыі

★ ★

Члены Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза

1. АНДРЭЕЎ А. А.
2. АНДРЫЯНАЎ В. М.
3. АРЫСТАЎ А. Б.
4. АРУЦІНАЎ Г. А.
5. БАБАЕЎ С.
6. БАГІРАЎ М. Д.
7. БАЙБАКОЎ Н. К.
8. БЕЛЯЕЎ Н. І.
9. БЕНЕДЗІКТАЎ І. А.
10. БЕРЫЯ Л. П.
11. БЕШЧЭЎ Б. П.
12. БАЙЦОЎ І. П.
13. БАРКОЎ Г. А.
14. БРЭЖНЕЎ Л. І.
15. БУЛГАНІН Н. А.
16. ВАГАПАЎ С. А.
17. ВАННІКАЎ Б. Л.
18. ВАСІЛЕЎСКІ А. М.
19. ВОЛКАЎ І. А.
20. ВОРАНАЎ Г. І.
21. ВАРАШЫЛАЎ К. Е.
22. ВЫШЫНСКІ А. Я.
23. ГАФУРАЎ Б.
24. ГАРАЧЭЎ Ф. С.
25. ГРЫШЫН В. В.
26. ГРЫШЫН І. Т.
27. ГУСЕЎ М. І.
28. ДЗЕНІСАЎ Г. А.
29. ЕГОРАЎ А. Н.
30. ЕФІМАЎ А. П.
31. ЕФРЭМАЎ Л. Н.
32. ЖДАНАЎ Ю. А.
33. ЖЭГАЛІН І. К.
34. ЖУКАЎ К. П.
35. ЗАСЯДЗЬКА А. Ф.
36. ЗВЕРЭЎ А. Г.
37. ЗІМЯНІН М. В.
38. ІГНАТАЎ Н. Г.
39. ІГНАЦЬЕЎ С. Д.
40. КАБАНАЎ І. Г.
41. КАГАНОВІЧ Л. М.
42. КАЛНБЕРЗІН Я. Э.
43. КАПІТОНАЎ І. В.
44. КЕЦХАВЕЛІ З. Н.
45. КІДЗІН А. Н.
46. КІРЫЧЭНКА А. І.
47. КІСЕЛЁЎ В. І.
48. КІСЕЛЁЎ Н. В.
49. КАУРЫГІНА М. Д.
50. КАЗЛОЎ Ф. Р.
51. КОНЕЎ І. С.
52. КАРНЕЙЧУК А. Е.
53. КАРОТЧАНКА Д. С.
54. КАРЧАГІН П. Н.
55. КАСЫГІН А. Н.
56. КРУГЛОЎ С. Н.
57. КУЗНЕЦОЎ В. В.
58. КУЗНЕЦОЎ Н. Г.
59. КУЛІЕЎ Т. І.
60. КУТЫРЭЎ А. М.
61. КУУСІНЕН О. В.
62. КЭБІН І. Г.
63. ЛАРЫЁНАЎ А. Н.
64. ЛАТУНОЎ І. С.
65. ЛЕБЕДЗЕЎ І. К.
66. ЛУК'ЯНАЎ В. В.
67. МАЛЕНКОЎ Г. М.
68. МАЛЫШЭЎ В. А.
69. МАРФІН А. І.
70. МГЕЛАДЗЕ А. І.
71. МЕЛЬНІК Д. Н.
72. МЕЛЬНІКАЎ Л. Г.
73. МЕХЛІС Л. З.
74. МІКАЯН А. І.
75. МІЦІН М. Б.
76. МІХАЙЛАЎ Н. А.
77. МОЛАТАЎ В. М.
78. МАСКВІН В. А.
79. МУРАТАЎ З. І.
80. МУХІТДЗІНАЎ Н. А.
81. НЕДАСЕКІН В. І.
82. НІКАЛАЕЎ Б. Ф.
83. НІЯЗАЎ А. І.
84. ОРГАНАЎ Н. Н.
85. ПАНКРАТАВА А. М.
86. ПАТОЛІЧАЎ Н. С.
87. ПЕГАЎ Н. М.
88. ПЕРВУХІН М. Г.
89. ПАНАМАРЭНКА П. К.
90. ПАСКРЭБЫШЭЎ А. Н.
91. ПАСПЕЛАЎ П. Н.
92. ПРАС Ф. М.
93. ПРАКОФ'ЕЎ В. А.
94. ПРОНІН В. П.
95. ПУЗАНАЎ А. М.
96. РАЗЗАКАЎ І. Р.
97. РУМЯНЦЭЎ А. М.
98. САБУРАЎ М. З.
99. СЁМІН А. В.
100. СМІРНОЎ Д. Г.
101. СНЕЧКУС А. Ю.
102. САКАЛОЎСКІ В. Д.
103. СТАЛІН І. В.
104. СУСЛАЎ М. А.
105. ТАЙБЕКАЎ Е. Б.
106. ТЕВАСЯН І. Ф.
107. ТІТОЎ П. І.
108. ТІТОЎ Ф. Е.
109. УСЦІНАЎ Д. Ф.
110. ФАДЗЕЕЎ А. А.
111. ХВАРАСТУХІН А. І.
112. ХРУНІЧЭЎ М. В.
113. ХРУШЧОЎ Н. С.
114. ЧЭПЛАКОЎ П. Ф.
115. ЧЭРНЫШОЎ В. Е.
116. ЧЭСНАКОЎ Д. І.
117. ШАЯХМЕТАЎ Ж.
118. ШВЕРНІК Н. М.
119. ШЭЛЕПІН А. Н.
120. ШЭПІЛАЎ Д. Т.
121. ШКІРАТАЎ М. Ф.
122. ЮДЗІН П. Ф.
123. ЮСУПАЎ У. Ю.
124. ЯКАЎЛЕЎ І. Д.
125. ЯСНОЎ М. А.

Кандыдаты ў члены Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза

1. АЛЕКСАНДРАЎ Г. Ф.
2. АЛЕКСЕНКА Г. В.
3. АРЦЕМ'ЕЎ П. А.
4. АХАЗАЎ Т. А.
5. БАГРАМЯН І. Х.
6. БАКРАДЗЕ В. М.
7. БАСІСТЫ Н. Е.
8. БАГДАНАЎ С. І.
9. БАНДАРЭНКА А. Д.
10. БАРЫСАЎ С. З.
11. БУДЗЕННЫ С. М.
12. БУТУЗАЎ С. М.
13. ВЕРШЫНІН К. А.
14. ГЕДВІЛАС М. А.
15. ГАГЛІДЗЕ С. А.
16. ГАРБАТАЎ А. В.
17. ГАРШЭНІН К. П.
18. ГРЭЧКО А. А.
19. ГРЫГАР'ЯН В. Г.
20. ГРАМЫКА А. А.
21. ДАНІЯЛАЎ А. Д.
22. ДЗВІНСКІ Б. А.
23. ДЗЕМЕНЦЬЕЎ П. В.
24. ДЫГАЙ Н. А.
25. ЕПІШЭЎ А. А.
26. ЕФРЭМАЎ Д. В.
27. ЖАВАРАНКАЎ В. Г.
28. ЖЫГАРЭЎ П. Ф.
29. ЖЫМЕРЫН Д. Г.
30. ЖУКАЎ Г. К.
31. ЗАВЕНЯГІН А. П.
32. ЗАРУБІН Г. Н.
33. ЗАХАРАЎ П. А.
34. ЗАХАРАЎ С. Е.
35. ІЛЬЧОЎ Л. Ф.
36. КАЗАКОЎ Н. С.
37. КАІРАЎ І. А.
38. КАЛЬЧЭНКА Н. Т.
39. КАНУННІКАЎ М. Я.
40. КАБУЛАЎ Б. З.
41. КАЗЛОЎ А. І.
42. КАМАРОЎ П. Т.
43. КАРНІЕЦ Л. Р.
44. КАСТАУСАЎ А. І.
45. КУЗНЕЦОЎ Ф. Ф.
46. КУЗНЕЦОВА К. С.
47. КУЛАЎ К. Д.
48. КУМЫКІН П. Н.
49. ЛАДАНАЎ П. Ф.
50. ЛАЦІС В. Т.
51. ЛАМАКА П. Ф.
52. ЛУЧЫНСКІ А. А.
53. ЛЫКАВА Л. П.
54. МАКСАРОЎ Ю. Е.
55. МАЛІК Я. А.
56. МАЛІНІН М. С.
57. МАЛІНОЎСКІ Р. Я.
58. МАМОНАЎ Ф. А.
59. МАСЛЕННІКАЎ І. І.
60. МЕЛЬНІКАЎ Р. Е.
61. МЕРЭЦКОЎ К. А.
62. МЕРКУЛАЎ В. Н.
63. МЮРЫСЕП А. А.
64. НЕДЗЕЛІН М. І.
65. НІКІЦІН П. В.
66. НАСЕНКА І. І.
67. ОРЛОЎ Г. М.
68. ОСТРАВІЦЯНАЎ К. В.
69. ПАУЛАЎ В. Н.
70. ПАУЛАЎ Д. В.
71. ПАЛЕЦКІС Ю. І.
72. ПАНЮШКІН А. С.
73. ПАРШЫН П. І.
74. ПІДТЫЧЭНКА М. М.
75. ПОМАЗНЕЎ М. Т.
76. ПАНАМАРОЎ Б. Н.
77. ПАПОЎ Г. М.
78. ПАСТАВАЛАЎ С. О.
79. ПЧЭЛЯКОЎ А. П.
80. РАЙЗЕР Д. Я.
81. РАБІКАЎ В. М.
82. РАСНОЙ В. С.
83. РУМЯНЦЭЎ С. С.
84. СЕРДЗЮК З. Т.
85. СЕРОЎ І. А.
86. СІМАНАЎ К. М.
87. СКУЛКОЎ І. П.
88. СОКАЛАЎ К. М.
89. САЛАУЕЎ Л. Н.
90. СЦЕПАНАЎ С. А.
91. СЦЕПАНАВА Е. А.
92. СТАЛЕТАЎ В. Н.
93. ТІМАШЭНКА С. К.
94. ТІХАМІРАЎ С. М.
95. ТОКА С. К.
96. ТУМАНАВА З. П.
97. ФЁДАРАЎ А. Г.
98. ФУРЦЭВА Е. А.
99. ХАХАЛОЎ А. У.
100. ХАХЛОЎ І. С.
101. ЦХОЎРЭБАШВІЛІ В. Г.
102. ЦЫРЭНЬ В. Ф.
103. ЧУЙКОЎ В. І.
104. ЧУМАЧЭНКА Г. А.
105. ШАТАЛІН Н. Н.
106. ШАШКОЎ З. А.
107. ШКОЛЬНІКАЎ А. М.
108. ШТЭМЕНКА С. М.
109. ЮДЗІН П. А.
110. ЮМАШЭЎ І. С.

Састаў Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі, выбранай XIX з'ездам партыі

1. АЛЕКСЕЕЎ А. І.
2. АНДРЭЕЎ В. А.
3. БАБІЧ В. І.
4. ГОРКІН А. Ф.
5. ГРЫШКО Г. Е.
6. ГРОМАЎ Г. П.
7. ГРОМАЎ Е. І.
8. ГУБІН К. А.
9. ДРУЗІН В. П.
10. ЕНЮЦІН Г. В
11. ЗАКУРДАЕЎ В І.
12. ЗІНЧЭНКА В. Е.
13. КАСЯЧЭНКА Г. П.
14. КРУЖКОЎ В. С.
15. КУЛАТАЎ Т.
16. МІРОНАВА З. Р.
17. МАСКАТАЎ П. Г.
18. МАСКОЎСКІ В. П.
19. ОВЕЗАЎ Б.
20. ОСІПАЎ Г. І.
21. ПАДГОРНЫ Н. В.
22. ПАДЦЭРОБ Б. Ф.
23. ПРАКОНЕН П. С.
24. РАСУЛАЎ Д.
25. РУДЗЬ Г. Я.
26. СЕМЕНАЎ В. С.
27. СКВАРЦОЎ Н. А.
28. САБЕНІН А. І.
29. СПІРЫДОНАЎ А. М.
30. СТРУЕЎ А. І.
31. СУЕЦІН М. С.
32. СУРКОЎ А. А.
33. ТАРАСАЎ М. П.
34. ТАРАСАЎ С. Н.
35. ТВАРДОЎСКІ А. Т.
36. ТРЭЦЬЯКОВА Е. І.
37. ЯКУБАЎ М. Т.

ДЗЁННІК З'ЕЗДА

Ранішняе паседжанне 10 кастрычніка

10 кастрычніка ў Вялікай зале Крэмлёўскага палаца прадаўжаў сваю работу XIX з'езд партыі.

Старшынствуючы т. **Багіраў** прадастаўляе слова для даклада па чацвертаму пункту парадку дня — «Змяненні ў Статуце ВКП(б)» сакратару ЦК ВКП(б) тав. **Н. С. Хрушчову.** Дэлегаты сустракаюць тав. Хрушчова бурнымі апладысментамі.

Тав. Хрушчоў гаворыць аб вялікіх перамогах нашага народа, атрыманых пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі, вялікага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна, аб велічных задачах комуністычнага будаўніцтва. Задачы, якія стаяць перад намі, указвае ён, прад'яўляюць да партыйных арганізацый, да ўсіх комуністаў яшчэ больш высокія патрабаванні, якія павінны быць улічаны ў практыцы партыйнай работы і партыйнага будаўніцтва.

З часу XVIII з'езда партыя ўзбагацілася новым вопытам партыйнага будаўніцтва, які павінен быць адлюстраваны ў Статуце. У сувязі з гэтым неабходна ўнесці дадаткі і змяненні ў Статут партыі.

Далей тав. Хрушчоў падрабязна абгрунтоўвае дадаткі і змяненні, якія ўносяцца ў Статут партыі.

Прымаемы з'ездам Статут партыі, гаворыць тав. Хрушчоў, заканчваючы свой даклад, — гэта дакумент велізарнай арганізуючай і мабілізуючай сілы. Ён з'явіцца важным сродкам узмацнення ідэйнага выхавання комуністаў, кадраў партыі і дзяржавы ў духу ленінізма, далейшага разгортвання ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, крытыкі і самакрытыкі. Статут узніме на новы, больш высокі ўзровень арганізатарскую работу партыі.

З'езд пераходзіць да абмеркавання даклада тав. Н. С. Хрушчова. Першым выступае т. **М. Ф. Шкіратаў,** сустрэты апладысментамі. Наша Комуністычная партыя, гаворыць ён, пад сцягам Леніна, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна прайшла слаўны і велічны шлях барацьбы і перамог. Гэтых перамог яна дабілася таму, што была заўсёды вернай вялікаму вучэнню Леніна—Сталіна.

Тав. Шкіратаў спыняецца на пытаннях узмацнення партыйнага кантроля і праверкі выканання рашэнняў, гаворыць аб вялікім значэнні ўважлівых адносін да пісем і заяў, што паступаюць у партыйныя арганізацыі.

Старшынствуючы прадастаўляе слова для прывітання генеральнаму сакратару Цэнтральнага Камітэта Французскай Комуністычнай партыі тав. **Марысу Тарэзу.** З'езд, стоячы, працяглымі апладысментамі сустракае правадыра французскага народа.

Пад бурныя апладысменты тав. Тарэз заяўляе:

— Мільёны і мільёны нашых суайчыннікаў даюць урачыстую клятву: «Французскі народ не будзе, ніколі не будзе ваяваць супраць Совецкага Саюза».

Прадаўжаюцца спрэчкі па дакладу тав. Н. С. Хрушчова. Слова атрымлівае т. **Фурцэва** (Масква). Яна гаворыць аб тым, што матэрыялы да XIX з'езда ВКП(б) з велізарнай актыўнасцю абмяркоўваліся на партыйных сходах і канферэнцыях сталіцы. У абстаноўцы поўнай свабоды крытыкі на гэтых сходах выступіла больш ста тысяч комуністаў. Яны аднадушна адобрылі гістарычныя дакументы Цэнтральнага Камітэта партыі. Выступае т. **Зімянін** (Беларуская ССР). Ён заяўляе, што комуністы Беларусі аднадушна адабраюць праект змененага Статута, і паведамляе пра рад дадаткаў і заўваг па праекту, выказаных пры яго абмеркаванні ў партарганізацыях.

Дэлегаты сустракаюць т. **А. Н. Паскрэбышэва** апладысментамі. У сваёй прамове ён гаворыць аб гістарычным значэнні XIX з'езда партыі, які вызначыў галоўную задачу для дадзенага перыяда — пабудову комунізма. Будаўніцтва комунізма ёсць творчасць мільёнаў. Гэта — невычэрпная ініцыятыва і наватарства працоўных, гэта высокая арганізаванасць і дысцыплінаванасць людзей, сапраўды ўсеагульны працоўны гераізм, незвычайна ўзросшая высокая культура працоўных горада і вёскі. Комунізм тым хутчэй можа надыйсці, чым лепш і больш арганізавана будуць працаваць усе совецкія грамадзяне, здольныя да працы. Тав. Паскрэбышэў, падрабязна спыняецца на пытаннях, звязаных з умацаваннем дзяржаўнай і партыйнай дысцыпліны, правільнага падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў, усямернага развіцця крытыкі і самакрытыкі.

Бурнымі апладысментамі сустракаюць дэлегаты генеральнага сакратара Комуністычнай партыі Іспаніі тав. **Даларэс Ібаруры,** якая перадае з'езду гарачае прывітанне ад іспанскіх комуністаў і іспанскіх народных мас. Яе яркая прамова была выслухана з вялікай увагай і неаднаразова перапынялася бурнымі апладысментамі.

Ад Народна-соцыялістычнай (комуністычнай) партыі Кубы з'езд вітаў генеральны сакратар партыі тав. **Блас Рока,** сустрэты працяглымі апладысментамі.

Вячэрняе паседжанне 10 кастрычніка

На вячэрнім паседжанні з'езда прадаўжалася абмеркаванне даклада тав. Н. С. Хрушчова аб зменах у Статуце ВКП(б). Дэлегаты ў сваіх выступленнях горача адабраюць праект змененага Статута партыі. Яны падкрэсліваюць, што праект Статута накіраваны на далейшае ўмацаванне сілы і магутнасці нашай партыі.

Старшынствуючы т. **Куусінен** прадастаўляе слова т. **Барысаву** (Якуцкая АССР). Праект змененага Статута партыі, гаворыць ён, адлюстроўвае накоплены за апошнія гады вопыт дзейнасці нашай партыі. Адабраючы праект Статута, прамоўца прапануе некаторыя дадаткі. Ён лічыць мэтазгодным дапоўніць трэці параграф праекта Статута ўказаннем на тое, што комуніст павінен строга захоўваць нормы комуністычнай маралі.

На канкрэтных прыкладах з практыкі ленінградскай партыйнай арганізацыі т. **Казлоў** (Ленінград) паказвае, наколькі наспела неабходнасць унесці змены ў Статут партыі, больш поўна вызначыць абавязкі членаў партыі. Ён падрабязна спыняецца на недахопах у падборы і расстаноўцы кадраў, у рабоце па выхаванню комуністаў у духу строгага захавання партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны.

Аб росце актыўнасці партыйных мас, выкліканай абмеркаваннем перадз'ездаўскіх дакументаў, гаворыць у сваім выступленні т. **Кліменка** (Варашылаўградская вобласць). Прамоўца выказаў пажаданне адлюстраваць у Статуце, што адзванасць ад мас, нячулыя адносіны да запатрабаванняў працоўных, бюракратызм, валакіта і зазнайства несумяшчальны з прабываннем у радах партыі.

Тав. **Якубаў** (Азербайджанская ССР) падкрэсліў у сваім выступленні, што прапануемыя змяненні ў Статуце партыі вынікаюць з практыкі ўнутрыпартыйнай работы, адлюстроўваюць наспеўшыя пытанні партыйнага будаўніцтва. На думку прамоўцы, у Статуце партыі належыць чотка вызначыць задачы і функцыі партыйных груп на вытворчасці.

Выступіўшы затым т. **Алімаў** (Узбекская ССР) заявіў, што праект змененага Статута ў поўнай меры адпавядае задачам партыі ў галіне арганізацыйнага кіраўніцтва. Ён яшчэ вышэй узнімае званне члена Комуністычнай партыі.

У ходзе абмеркавання праекта змененага Статута, гаворыць т. **Афонаў** (Казахская ССР), комуністы ўскрылі і падверглі крытыцы недахопы і слабасці ў партыйна-арганізацыйнай і ідэалагічнай рабоце партыйных арганізацый рэспублікі.

Пасля кароткага перапынку старшынствуючы прадастаўляе слова т. **Сабураву** для паведамлення аб выніках работы выбранай з'ездам Камісіі па разгляду папраўак і дадаткаў да праекта дырэктыў за пятаму пяцігадоваму плану развіцця СССР на 1951—1955 гады.

Дырэктывы XIX з'езда партыі па пятаму пяцігадоваму плану развіцця СССР на 1951—1955 гады прымаюцца з'ездам аднагалосна пад бурныя апладысменты.

Выступае т. **Кірычэнка** (Украінская ССР). Праект змененага Статута, гаворыць ён, узнімае на новую, вышэйшую ступень арганізацыйную работу партыі, з усёй паўнатой абагульняе вопыт партыйнага будаўніцтва, накоплены за гады пасля XVIII з'езда ВКП(б).

Спасылаючыся на вопыт партыйнай арганізацыі Украіны, прамоўца падкрэслівае своечасовасць і важнасць удакладнення задач мясцовых партыйных арганізацый, што зроблены ў праекце змененага Статута партыі.

У канцы вячэрняга паседжання з'езд віталі прадстаўнікі зарубежных комуністычных партый. Працяглымі апладысментамі сустракаюць дэлегаты паяўленне на трыбуне старшыні Компартыі Нарвегіі тав. **Зміля Леўліена.**

На трыбуне прадстаўнік ЦК Компартыі Інданезіі. Пасля кароткай прамовы, якая неаднаразова перапынялася бурнымі апладысментамі, ён зачытвае прывітанне ЦК Компартыі Інданезіі XIX з'езду ВКП(б).

З'езд вітае прадстаўнік Компартыі Венесуэлы тав. **Ф. Баланос.** Яго прамову дэлегаты з'езда суправаджаюць бурнымі апладысментамі.

Гарачае брацкае прывітанне ад алжырскіх комуністаў перадае з'езду сакратар Комуністычнай партыі Алжыра тав. **Ларбі Бухалі.** Абвешчаная ім здравіца ў чэсць вялікага Сталіна выклікае ўзнёслую авацыю ўсіх прысутных.

Ранішняе паседжанне 11 кастрычніка

11 кастрычніка на ранішнім паседжанні з'езда прадаўжаліся спрэчкі па дакладу тав. Н. С. Хрушчова аб змяненнях у Статуце ВКП(б). Ва ўсіх выступленнях дэлегатаў падкрэсліваецца думка аб тым, што зменены Статут будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню нашай партыі, павышэнню яе арганізуючай ролі ў барацьбе за паспяховае вырашэнне задач комуністычнага будаўніцтва.

Слова прадастаўляецца т. **Жукаву** (Варонежская вобласць). Ён гаворыць аб тым, што комуністы на сваіх сходах аднадушна адобрылі праект змененага Статута партыі, у якім абагулены багацейшы вопыт арганізацыйнай работы партыі. Неабходнасць змен, якія ўносяцца ў Статут, дыктуецца самім жыццём, задачамі, што стаяць цяпер перад партыяй.

Тав. **Баркоў** (Саратаўская вобласць) указвае ў сваім выступленні, што праект змененага Статута чотка і ясна вызначае галоўныя задачы партыі, яе арганізацыйныя прынцыпы, абавязкі і правы членаў партыі, функцыі мясцовых партыйных арганізацый. Прамоўца характарызуе некаторыя прапановы да праекта Статута, выказаныя комуністамі на сходах, канферэнцыях і ў партыйным друку.

Пытанням партыйна-палітычнай работы ў Совецкай Арміі прысвячае сваё выступленне т. **Кузнецоў** (Масква). Ён заяўляе, што праект змененага Статута сустрэў у армейскіх комуністаў поўнае адабрэнне.

На ранішнім паседжанні ў спрэчках выступілі таксама тт. **Чэплакоў** (Сахалінская вобласць), **Вагапаў** (Башкірская АССР), **Румянцэў** (Вялікалукская вобласць), **Хахалаў** (Бурат-Мангольская АССР), **Підтычэнка** (Украінская ССР).

Старшынствуючы т. **Шаяхметаў** паведамляе, што на імя XIX з'езда ВКП(б) атрымана прывітанне ад Комуністычнай партыі Злучаных Штатаў Амерыкі. З'езд сустракае гэтае паведамленне бурнымі, працяглымі апладысментамі.

Члены дэлегацыі Комуністычнай партыі Амерыкі, гаворыць т. Шаяхметаў, не прысутнічаюць на нашым з'ездзе таму, што «амерыканская дэмакратыя» не дапусціла іх выезду на з'езд. Урад ЗША адмовіў у выдачы віз членам дэлегацыі Комуністычнай партыі Амерыкі.

Тэкст прывітання ад Комуністычнай партыі ЗША зачытвае т. **Патолічаў.** Дэлегаты выслухоўваюць словы прывітання з велізарнай увагай. У зале раздаюцца бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю. Усе ўстаюць.

Захапляючай авацыяй сустракае з'езд паяўленне на трыбуне старшыні Соцыялістычнай адзінай партыі Германіі тав. **Вільгельма Піка.** Яго яркая прамова неаднаразова перапыняецца працяглымі апладысментамі. Тав. Вільгельм Пік гаворыць аб барацьбе, якая ўсё больш узмацняецца, нямецкага народа за адзіную, дэмакратычную, міралюбівую Германію, супраць пагрозы новай вайны. Заключныя словы яго прамовы — здравіца ў чэсць таварыша Сталіна — тонуць у буры апладысментаў, якія пераходзяць у авацыю. Дэлегаты з'езда, стоячы, вітаюць выпрабаванага кіраўніка нямецкага народа.

Гарачае прывітанне перадае з'езду цёпла сустрэты дэлегатамі сакратар Цэнтральнага Камітэта Компартыі Уругвая тав. **Радней Арысмендзі.**

З'езд вітае генеральны сакратар Компартыі Галандыі тав. **Пауль дэ Гроот.** Пад бурныя апладысменты дэлегатаў ён перадае прэзідыуму з'езда сцяг, зроблены партыйнай арганізацыяй Амстэрдама, на якім напісана: «Галандскія рабочыя ніколі не будуць ваяваць супраць Совецкага Саюза».

Старшыня Компартыі Швецыі тав. **Хільдзінг Хагберг** перадае з'езду баявое прывітанне ад комуністаў Швецыі.

Вячэрняе паседжанне 11 кастрычніка

На вячэрнім паседжанні з'езда прадаўжаліся спрэчкі па дакладу тав. Н. С. Хрушчова аб змяненнях у Статуце ВКП(б).

Старшынствуючы т. **Андрыянаў** прадастаўляе слова т. **Лебедзеву** (Омская вобласць). Прамоўца гаворыць аб велізарнай актыўнасці комуністаў пры абмеркаванні праекта змененага Статута. Дадаткі і змены ў праект Статута, якія ўносіліся на партыйных сходах, указвае т. Лебедзеў, былі прадыктаваны клопатамі комуністаў аб далейшым умацаванні партыі, павышэнні адказнасці кожнага комуніста за выкананне вялікіх задач, пастаўленых партыяй.

Тав. **Захараў** (Ленінград) спыняецца ў сваім выступленні на пытаннях работы партыйных арганізацый Ваенна-Марскога Флота.

Выступае т. **Каснаускайтэ** (Літоўская ССР). Яна падкрэслівае значэнне таго факта, што ў праекце Статута чотка вызначаны задачы пярвічных партыйных арганізацый, павышаецца іх роля ў барацьбе за справу партыі. Гэта, прадаўжае т. Каснаускайтэ, ускладвае вялікую адказнасць на партыйныя органы за далейшае палепшанне кіраўніцтва пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі.

Затым у спрэчках выступілі тт. **Цхоўрэбашвілі** (Грузінская ССР), **Гарачэў** (Цюменская вобласць), **Ільічоў** (Масква) і **Лук'янаў** (Яраслаўская вобласць).

(Заканчэнне на 3-й стар.).

XIX з'езд Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)

ДЗЁННІК З'ЕЗДА

(Заканчэнне).

Старшынствуючы паведамляе, што ў прэзідыум паступіла прапанова аб спыненні спрэчак па чацвертаму пункту парадку дня. Гэтая прапанова прымаецца. Тав. Н. С. Хрушчоў ад заключнага слова адмаўляецца.

Па прапанове тав. **М. А. Суслава** з'езд аднагалосна прымае рашэнне па дакладу тав. Н. С. Хрушчова:

Тэкст змененага Статута партыі прыняць за аснову.

Для разгляду і ўнясення паправак і дадаткаў у тэкст змененага Статута партыі з'ездам створана камісія.

У канцы вячэрняга паседжання з'езд віталі прадстаўнікі зарубежных комуністычных і рабочых партый. Дэлегаты цёпла сустракалі гасцей.

З прывітальнай прамовай выступае прадстаўнік ЦК Компартыі Турцыі тав. **І. Білен.** Ён гаворыць, што турэцкія комуністы заўсёды будуць верныя справе пролетарскага інтэрнацыяналізма, справе Леніна — Сталіна.

На трыбуне генеральны сакратар ЦК Компартыі Грэцыі тав. **Н. Захарыадзіс.** Яго яркая, пранікнёная прамова была выслухана з глыбокай увагай і неаднаразова перапынялася бурнымі апладысментамі.

З прывітаннямі XIX з'езду таксама выступілі член сакратарыята ЦК Компартыі Свабоднай Тэрыторыі Трыест тав. **Баномо Тамінец,** старшыня Комуністычнай партыі Даніі тав. **Аксель Ларсен,** генеральны сакратар ЦК Народнай партыі Ірана тав. **Р. Радманеш,** генеральны сакратар Комуністычнай партыі Сірыі і Лівана тав. **Х. Бахдаш.**

Ранішняе паседжанне 13 кастрычніка

13 кастрычніка ў Вялікай зале Крэмлёўскага палаца прадаўжаў сваю работу XIX з'езд партыі.

Старшынствуючы на ранішнім паседжанні т. **Ніязаў** прадастаўляе слова для прапановы тав. **Л. М. Кагановічу,** якога дэлегаты сустракаюць працяглымі апладысментамі.

Па даручэнню Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) тав. Каганавіч уносіць прапанову аб перапрацоўцы праграмы партыі. Ён характарызуе карэнныя змены, якія адбыліся як у галіне міжнародных адносін, так і ў галіне будаўніцтва соцыялізма ў СССР за перыяд з VIII з'езда, на якім была прынята праграма партыі. У сувязі з гэтымі зменнямі рад палажэнняў праграмы і ізложаныя ў ёй задачы, паколькі яны ўжо ажыццёўлены за гэты перыяд, не адпавядаюць больш сучасным умовам і новым задачам партыі. У заключэнне тав. Каганавіч абвяшчае праект рэзалюцыі аб перапрацоўцы праграмы Комуністычнай партыі Совецкага Саюза.

Слова прадастаўляецца т. **Андрыянаву.** З прычыны таго, заяўляе ён, што пытанне аб перапрацоўцы праграмы партыі не новае, што яно ўжо разглядалася на XVIII з'ездзе партыі і з'яўляецца зусім ясным для дэлегатаў з'езда, па даручэнню ленінградскай і маскоўскай дэлегацый прапаную спрэчак па гэтаму пытанню не адкрываць і прыняць праект рэзалюцыі, унесены тав. Кагановічам. **(Апладысменты).**

Прапанова т. Андрыянава прымаецца.

Рэзалюцыя аб перапрацоўцы праграмы Комуністычнай партыі Совецкага Саюза зацвярджаецца аднагалосна.

Выбранне таварыша І. В. Сталіна Старшынёй Камісіі па перапрацоўцы праграмы партыі з'езд сустракае бурнай працяглай авацыяй.

Затым з'езд вітаюць цёпла сустрэтыя дэлегатамі прадстаўнікі зарубежных комуністычных і рабочых партый.

Гарачае прывітанне з'езду перадаюць старшыня Комуністычнай партыі Германіі тав. **Макс Рэйман,** сакратар Цэнтральнага Камітэта Адзінай соцыялістычнай партыі Ісландыі тав. **Б. Б'ярнасон,** старшыня Комуністычнай партыі Аўстрыі тав. **І. Копленіг,** генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Ізраіля тав. **С. Мікуніс,** генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Люксембурга тав. **Д. Урбані,** генеральны сакратар Швейцарскай партыі Працы тав. **Э. Воог,** старшыня «Саюза югаслаўскіх патрыётаў па вызваленню народаў Югаславіі ад фашысцкага прыгнёту клікі Ціто—Ранкавіча і імперыялістычнай няволі» тав. **П. Папівода.**

Старшынствуючы паведамляе, што на імя з'езда атрыманы прывітанні ад зарубежных комуністычных і рабочых партый. Пад працяглыя апладысменты абвяшчаюцца прывітанні ад Комуністычнай партыі Мексікі, Комуністычнай партыі Чылі, Комуністычнай партыі Пакістана, Комуністычнай партыі Таіланда, Комуністычнай партыі Цэйлона, Комуністычнай партыі Парагвая, Комуністычнай партыі Эквадора, Прагрэсіўнай партыі працоўных Кіпра, Комуністычнай партыі Гватэмалы, Комуністычнай партыі Пуэрто-Рыко, Комуністычнай партыі Сан-Марыно і Комуністычнай партыі Новай Зеландыі.

Вячэрняе паседжанне 13 кастрычніка

Вячэрняе паседжанне адкрылася пад старшынствам тав. **Патолічава.** Было заслухана паведамленне аб выніках работы камісіі, выбранай з'ездам, па разгляду прапаноў і дадаткаў да праекта змененага Статута партыі.

Аднагалосна пад бурныя апладысменты прымаецца рэзалюцыя аб змяненні найменавання партыі. З'езд пастанаўляе:

«Усесаюзную Комуністычную партыю большэвікоў (ВКП(б) з гэтага часу іменаваць «Комуністычная партыя Совецкага Саюза (КПСС)».

Затым з'езд аднагалосна прымае рэзалюцыю аб змяненнях у Статуце ВКП(б), зацвярджае Статут Комуністычнай партыі Совецкага Саюза. У зале ўзнікаюць бурныя, працяглыя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю.

Заключнае паседжанне XIX з'езда партыі

14 кастрычніка ў Вялікай зале Крэмлёўскага палаца адбылося заключнае паседжанне XIX з'езда Комуністычнай партыі Совецкага Саюза.

9 гадзін вечара. На трыбуне паяўляюцца таварыш Сталін, яго бліжэйшыя саратнікі тт. Молатаў, Маленкоў, Варашылаў, Булганін, Берыя, Каганавіч, Хрушчоў, Андрэеў, Мікаян, Касыгін, Швернік, члены Прэзідыума з'езда. Дэлегаты і госці сустракаюць іх бурнымі, доўга не змаўкаючымі апладысментамі. Усе ўстаюць. У зале ўзнікае авацыя ў чэсць таварыша Сталіна. Раздаюцца воклічы «Слава таварышу Сталіну!», «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Таварышу Сталіну—ура!». Сардэчныя пачуцці бязмежнай любві і адданасці вялікаму правадыру, другу і настаўніку працоўных выражаюць у адзіным парыве і дэлегаты з'езда — комуністы Совецкага Саюза і прадстаўнікі комуністычных і рабочых партый зарубежных краін, якія прысутнічаюць на з'ездзе.

Старшынствуючы тав. **Варашылаў** аб'яўляе паседжанне адкрытым.

Слова для паведамлення аб выніках выбараў цэнтральных органаў Комуністычнай партыі Совецкага Саюза прадастаўляецца тав. **Кузнецову.**

Членамі Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі выбрана 125 таварышаў. Калі ў ліку выбраных у члены ЦК называецца імя таварыша Сталіна, зала зноў бурна апладыруе. Усе ўстаюць і вітаюць таварыша Сталіна працяглай авацыяй. Чуваць прывітальныя воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Таварышу Сталіну — ура!». Апладысментамі сустракаюцца імёны бліжэйшых саратнікаў таварыша Сталіна. Кандыдатамі ў члены Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі выбрана 110 таварышаў, у Цэнтральную Рэвізійную Камісію — 37 таварышаў.

Пасля зачытання вынікаў выбараў у цэнтральныя органы партыі з'езд заслухоўвае прывітанне прадстаўніка Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Бірмы. Цёпла сустрэты ўсімі ўдзельнікамі паседжання, ён гаворыць, што з дня перамогі Кастрычніцкай рэволюцыі Совецкая краіна з'яўляецца маяком і надзеяй для ўсіх прыгнечаных народаў свету. Совецкі Саюз, таварыш Сталін ідуць у авангардзе барацьбы народаў за мір і свабоду і тым заслужылі сабе любоў і павагу ўсіх каланіяльных і залежных народаў зямнога шара.

Слова для прывітання прадастаўляецца сустрэтаму бурнымі апладысментамі тав. **Леслі Морысу** — члену Выканаўчага Камітэта Рабочай прагрэсіўнай партыі Канады.

Прысутнічаць тут і чуць аб дасягненнях і вялікіх планах магутнай Комуністычнай партыі Совецкага Саюза, усклікае ён, бачыць вакол сябе герояў працы, герояў Айчыннай вайны, увачавідкі бачыць будаўніцтва комуністычнага грамадства, аб якім так даўно марыла чалавецтва, — гэта значыць глядзець у будучыню не толькі Совецкага Саюза, але і ўсіх народаў.

Прамова тав. Леслі Морыса неаднаразова перапынялася працяглымі апладысментамі.

Зала бурна апладыруе, калі на трыбуну выходзіць тав. **А. Гопалан** — член Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Індыі. Ён перадае гарачае брацкае рэволюцыйнае прывітанне з'езду ад усіх комуністаў, ад імя свабодалюбівага народа Індыі.

Імперыялісты хочуць уцягнуць Індыю ў лагер вайны, але народ Індыі ніколі не дапусціць гэтага. Ён будзе ўпорна супраціўляцца ўсім тым, хто распальвае вайну. Мы паклапоцімся аб тым, заяўляе прамоўца, каб народ Індыі аб'яднаўся з Совецкім Саюзам, Кітаем, краінамі народнай дэмакратыі, з усімі міралюбівымі народамі ў барацьбе за трывалы мір, свабоду і дэмакратыю.

Пад бурныя, працяглыя апладысменты дэлегатаў і гасцей з'езда тав. Гопалан абвяшчае здравіцы ў чэсць адзінства індыйскага і совецкага народаў, у чэсць адзінства ўсіх працоўных свету, у чэсць Комуністычнай партыі Совецкага Саюза і яе вялікага правадыра таварыша Сталіна.

Дэлегат Індыйскай компартыі, закончыўшы сваю прамову і па ўсходняму звычаю пакланіўшыся спачатку ў бок залы, а затым — прэзідыума, пад апладысменты прысутных сходзіць з трыбуны. У зале на нейкае імгненне ўстанаўляецца цішыня. Старшынствуючы аб'яўляе:

— Слова прадастаўляецца таварышу Сталіну.

Вялікі правадыр устае са свайго месца і роўным, мерным крокам накіроўваецца да трыбуны. Насустрач яму ўзнімаецца магутная авацыя. Зала ўстае, дрыжаць сцены Крэмлёўскага палаца ад раскатаў «ура». На розных мовах нясуцца прывітанні. Усё, чым поўна душа совецкага чалавека, усё, што ёсць самага дарагога ў комуніста — укладваецца ў гэтую авацыю, якая выражае бязмежнае мора любві, адданасці партыі, свайму правадыру. Праходзіць мінута, дзве, тры... Авацыя, як горная лавіна, нарастае ўсё больш і больш. Яна спыняецца толькі тады, калі верх нарэшце, бярэ жаданне хутчэй пачуць сталінскае слова...

Таварыш Сталін пачынае сваю прамову выражэннем падзякі ад імя з'езда ўсім брацкім партыям, прадстаўнікі якіх выказалі пашану XIX з'езду сваёй прысутнасцю або якія прыслалі ў адрас з'езда прывітальныя звароты; вялікі правадыр дзякуе ім за брацкія прывітанні і давер'е, якое азначае гатоўнасць падтрымаць нашу партыю ў яе барацьбе за светлую будучыню народаў, у яе барацьбе супраць вайны, за захаванне міру... Прысутныя адказваюць на гэтыя словы правадыра бурнымі апладысментамі, якія пракатваюцца з канца ў канец велізарнай Крэмлёўскай залы.

Усе, хто прысутнічае ў зале, затаіўшы дыханне, слухаюць кожнае сталінскае слова, глыбока і шчыра перажываючы яго. Накіпаючыя пачуцці, думкі, выкліканыя словамі правадыра, выліваюцца ў бурны шквал апладысментаў. Вось таварыш Сталін гаворыць аб тым, што наша партыя не павінна заставацца ў даўгу ў брацкіх компартый. Пасля ўзяцця ўлады ў кастрычніку 1917 года яны пачалі называць нашу партыю «Ударнай брыгадай» сусветнага рэволюцыйнага і рабочага руху, выражаючы гэтым надзею, што нашы поспехі аблегчаць становішча народам, якія пакутуюць пад прыгнётам капіталізма. Думаю, гаворыць павольна вялікі правадыр, што наша партыя апраўдала гэтыя надзеі... І ў зале ўзнікае магутная авацыя. Яна пачынаецца ў ложы, дзе сядзяць прадстаўнікі брацкіх партый, дзе мы бачым выдатных дзеячоў міжнароднага рабочага руху — Вільгельма Піка, Марыса Тарэза, Балеслава Берута, Клемента Готвальда, Маціяса Ракашы, Г. Георгіу-Дэж, Вылко Чэрвенкава, Даларэс Ібаруры і многіх другіх.

З незатоеным сарказмам вялікі правадыр гаворыць аб буржуазіі. Раней буржуазія была главой нацыі. Цяпер яна нацыянальны суверэнітэт прадае за амерыканскія далары. І таварыш Сталін падкрэслівае, звяртаючыся да прадстаўнікоў брацкіх партый, што сцяг свабоды нацый прыдзецца ўзняць ім, комуністам, калі яны хочуць стаць кіруючай сілай нацыі. У адказ на гэтыя словы зноў узнімаецца гром апладысментаў.

Заключныя словы таварыша Сталіна:

— Няхай жывуць нашы брацкія партыі!

— Няхай жывуць і здраўствуюць кіраўнікі брацкіх партый!

— Няхай жыве мір паміж народамі!

— Далоў падпальшчыкаў вайны! — пакрываюцца бурнымі, доўгімі апладысментамі з'езда. Дэлегаты з'езда і госці наладжваюць грандыёзную авацыю ў чэсць таварыша Сталіна.

З заключнай прамовай выступае тав. Варашылаў.

У 22 гадзіны 25 мінут старшынствуючы аб'яўляе XIX з'езд Комуністычнай партыі Совецкага Саюза закрытым. **Бурныя апладысменты. Усе ўстаюць. Воклічы: «Таварышу Сталіну — ура!», «Слава вялікаму Сталіну!». Дэлегаты з'езда і госці з вялікім натхненнем спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал». Зноў успыхвае бурная авацыя ў чэсць вялікага Сталіна. З усіх канцоў залы на многіх мовах нясуцца воклічы прывітанняў любімаму правадыру і настаўніку вялікаму Сталіну.**

У гэтыя дні

★

П. КАВАЛЕЎ

★

Мы перажываем сапраўды вялікасныя, векапомныя дні.

З глыбокай увагай і радасным хваляваннем усе мы сачылі за работаю з'езда нашай Комуністычнай партыі — партыі, якую справядліва народ наш назваў **сваёй, роднай, блізкай,** з якою прайшоў совецкі народ вялікі і пачэсны шлях, адстаяў сваю свабоду, свабоду сваёй краіны ў барацьбе з рознымі і разнастайнымі ворагамі, умацаваў першую ў свеце соцыялістычную дзяржаву — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і пракладвае шлях наперад усяму чалавецтву.

Даклад сакратара ЦК партыі таварыша Г. М. Маленкова — дакумент вялікага ідэйнага, практычнага і гістарычнага значэння. У ім увасоблена мудрасць нашай партыі—сталінская мудрасць. У ім—песня слаўных падзей нашай краіны і веліч спраў, якія вырашала за час паміж сваімі з'ездамі наша партыя і будзе няўхільна, нястомна вырашаць у будучым.

Пачуццём гордасці за нашу краіну і яе соцыялістычны, самы магутны ў свеце лад, чысцінёю радаснай усхваляванасці напаўняюцца нашы сэрцы пры чытанні дакументаў з'езда.

Мы не можам без пачуцця задаволенасці і гордасці чытаць радкі дырэктыў партыі па новай пяцігодцы:

«Гэты (пяты) пяцігадовы план зноў дэманструе перад усім светам вялікую жыццёвую сілу соцыялізма, карэнныя перавагі соцыялістычнай сістэмы гаспадаркі перад капіталістычнай сістэмай. Гэты пяцігадовы план з'яўляецца планам мірнага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Ён будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню і расшырэнню эканамічнага супрацоўніцтва Совецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі і развіццю эканамічных зносін з усімі краінамі, якія жадаюць развіваць гандаль на пачатках раўнапраўя і ўзаемнай выгады».

Такая ясная праўда наша. Мы яе не ўтойваем ні ад нашых прыяцеляў, ні ад нашых ворагаў. Горш для ворагаў нашых, якія ўтойваюць ад асобных народаў усё тое мірнае, стваральнае, якім жыве наша магутная краіна.

Прысутнасць і выступленне на з'ездзе нашай партыі шматлікіх прадстаўнікоў зарубежных комуністычных і рабочых партый, шматлікія прывітанні з'езду з розных краін свету — сведчанне інтэрнацыянальных пабуджэнняў нашай краіны, нашай партыі і ўрада. Але гэта і адзнака моцная таго, што нашы добрыя намеры жыць у дружбе з усімі народамі знойдуць у свеце новы прыліў народнай прыхільнасці да вялікай, мудрай справы партыі комуністаў, партыі Леніна—Сталіна.

Нам, совецкім літаратарам і работнікам усіх галін мастацтва, трэба вывучаць матэрыялы з'езда. Гэта невычэрпная крыніца думак, указанняў партыі. Крытыка недахопаў нашай літаратуры і мастацтва, дадзеная ў дакладзе таварыша Маленкова, справядлівая, і яна поўнасцю адносіцца і да нашай беларускай совецкай літаратуры і мастацтва.

«Нашы мастакі, літаратары, работнікі мастацтва, — гаворыць таварыш Маленкоў, — у сваёй творчай рабоце па стварэнню мастацкіх вобразаў павінны пастаянна памятаць, што тыпова не толькі тое, што найбольш часта сустракаецца, але тое, што з найбольшай паўнатой і завостранасцю выражае сутнасць данай соцыяльнай сілы. У марксісцка-ленінскім разуменні тыповае зусім не азначае нейкае статыстычнае сярэдняе. Тыповасць адпавядае сутнасці данай соцыяльна-гістарычнай з'явы, а не проста з'яўляецца найбольш пашыраным, часта паўтараючымся, будзённым. Свядомае пераўвелічэнне, завастрэнне вобраза не выключае тыповасці, а паўней раскрывае і падкрэслівае яе. Тыповае ёсць асноўная сфера праяўлення партыйнасці ў рэалістычным мастацтве».

Наш абавязак — працаваць з падвоенай энергіяй, чула прыслухоўвацца да голасу партыі, выконваць няўхільна і паслядоўна яе мудрыя ўказанні.

Беларускі народ у гэтыя дні, як і ўвесь совецкі народ, як ніколі дэманструе сваю згуртаванасць вакол партыі, сваю адданасць вялікай партыі Леніна—Сталіна, сваю любоў да найвялікшага чалавека, генія, правадыра партыі і народа, вялікага настаўніка, роднага Сталіна. Ён добра ведае, што поспехамі сваімі ў адраджэнні ўшчэнт разбуранай вайной прамысловасці, выпуск прадукцыі якой у 1952 годзе складае 150 працэнтаў да даваеннага, узняццем сельскай гаспадаркі, ростам добрабыту і культуры абавязаны партыі, Саюзнаму ўраду і асабіста таварышу Сталіну.

Гэта іх клопатамі, бацькоўскай увагай, дапамогаю вялікага рускага народа і ўсіх брацкіх народаў СССР Беларусь наша стала непазнавальнай. Новыя гарызонты раскрываюцца ў сувязі з асушэннем Палескай нізіны.

Разбурэнні, велізарнейшыя страты, пакуты, да якіх давялі наш народ фашысцкія акупанты, адыйшлі як страшны сон. Хутка залечаны цяжкія раны, дасягнуты поспехі, якіх не ведала і ведаць не будзе ні адна з капіталістычных краін, пакуль там пануе, гаспадарыць банкір ды буржуй, пакуль там ва ўладзе крывяжэрны капіталістычны грабежніцкі клас.

«Хуткае адраджэнне народнай гаспадаркі Беларусі пасля Айчыннай вайны,— гаварыў на XIX з'ездзе ВКП(б) таварыш Патолічаў, — гэта перамога ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, пераканаўчы прыклад правільнага вырашэння нацыянальнага пытання, праблемы супрацоўніцтва нацый у многанацыянальнай дзяржаве».

Несучы стаханаўскую вахту ў чэсць з'езда, працоўныя нашай рэспублікі ў гэтыя дні выпускаюць звыш плана аўтамабілі, трактары, станкі, веласіпеды, шарыкападшыпнікі, тканіну, многія іншыя віды прамысловай прадукцыі. Мінскія аўтамабілебудаўнікі выканалі гадавое заданне па выпуску 25-тонных самазвалаў для вялікіх будоўляў комунізма. Машынабудаўнікі завода «Ударнік» выпускаюць у лік снежня магутныя канавакапацелі. Машынабудаўнікі завода «Гомсельмаш» далі звыш плана 112 сартыровак, многа зернесушыльных машын і сіласных камбайнаў.

Многія прамысловыя прадпрыемствы, прадпрыемствы транспарта і сувязі Мінска, Магілёва, Віцебска, Гомеля, Гродна і іншых гарадоў датэрмінова выканалі свае вытворчыя планы і даюць многа звышпланавай прадукцыі. На 110 працэнтаў выканала план 3-га квартала мяса-малочная прамысловасць БССР.

У гэтыя дні калгаснае сялянства паспяхова завяршае ў цяжкіх кліматычных умовах сельскагаспадарчы год. Раён за раёнам рапартуюць аб датэрміновым выкананні планаў паставак сельскагаспадарчых прадуктаў і сыравіны для прамысловасці.

Сёння, у гэтыя гістарычныя дні, ва ўсіх нас, совецкіх людзей, адна думка, адно жаданне — зрабіць больш для сваёй Радзімы і зрабіць лепш. Сваёю працай, сваімі справамі на любым участку працы быць дастойнымі грамадзянамі сваёй магутнай Совецкай дзяржавы.

Сваёй геніяльнай працай «Эканамічныя праблемы соцыялізма ў СССР» таварыш Сталін вызначыў шляхі пераходу ад соцыялізма да комунізма. Выступленне таварыша Сталіна на заключным паседжанні XIX з'езда ВКП(б) — гэта баявая праграма барацьбы ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва за свабоду, мір і дэмакратыю, супраць агрэсіўных планаў падпальшчыкаў вайны. Тэарэтычныя выступленні таварыша Сталіна, як пражэктарам, асвятляюць усяму чалавецтву шлях уперад, да комунізма.

З табою, партыя комуністаў, з табою, родны Сталін наш, пойдзем згуртаванымі радамі ў комунізм. Ва ўсіх у нас жыве цвёрдая надзея, што будзе мір на зямлі, будзе ўсё ярчэй і ярчэй свяціць сонца комунізма чалавецтву, якое вызваляецца з царства старога свету і выходзіць насустрач свайму новаму дню.

Велічныя перспектывы

◆

В. КАРОЛЬ,

начальнік Упраўлення па справах архітэктуры пры Совеце Міністраў БССР.

◆

Выкрашэнне шырока задуманых па свайму маштабу, выразных ансамбляў совецкага горада — адна з важнейшых праблем соцыялістычнага рэалізма ў архітэктуры.

Пытанні архітэктурнага ансамбля з асаблівай вастрынёй паўсталі перад архітэктарамі ў пасляваенныя гады, калі велізарны размах будаўніцтва вымагаў вырашэння раду складаных градабудаўнічых задач і новага ўздыму архітэктурнага майстэрства. У новай пяцігодцы перад совецкімі архітэктарамі адкрываюцца новыя велізарныя магчымасці ансамблевага будаўніцтва. Архітэктары будуць праектаваць і будаваць не толькі асобныя будынкі, але і цэлыя комплексы будынкаў, вуліц, плошчаў, кварталаў, аб'яднаных адзінствам ідэйна-мастацкай задумы і будаўнічa-тэхнічнага выканання, якія выражаюць веліч і магутнасць нашай эпохі, сталінскія клопаты аб чалавеку.

У рашэннях партыі і ўрада па пытаннях градабудаўніцтва ёсць рад указанняў, якія маюць прамыя адносіны да праблемы ансамбля. У гэтых дакументах асаблівая ўвага звяртаецца на захаванне ў забудове горада кампазіцыйнага адзінства, выкарыстанне класічнай архітэктурнай спадчыны, пошукаў новага зместу архітэктуры горада і г. д.

Ансамбль — вышэйшая форма архітэктурнай творчасці — грунтуецца ў нас на планавай забудове ўсяго горада.

Ансамбль для нас—не абстрактная эстэтычная катэгорыя. Калі мы разглядаем архітэктурны ансамбль праспекта імя І. В. Сталіна ў Мінску ці архітэктурныя ансамблі асноўных вуліц і плошчаў Гомеля, Віцебска, Магілёва, то гаворым не толькі аб кампазіцыі, архітэктуры і сілуэце, але і ўлічваем шырыню праезджай часткі і тратуараў вуліц, зялёныя насаджэнні, асветлянасць памяшканняў, бытавое абсталяванне кватэр, добраўпарадкаванне двароў і іншае.

Традыцыі і наватарства маюць велізарнае значэнне пры стварэнні архітэктурнага ансамбля. Але з вопыту мінулага мы павінны браць і скарыстоўваць толькі тое, што па сваёй форме і па свайму зместу будзе дапамагаць стварэнню совецкага ансамбля.

Ёсць магчымасці ўзнавіць на сучаснай аснове выдатныя традыцыі рускіх градабудаўнікоў.

Камбініраванне суцэльнай забудовы з водступамі і разрывамі, з раскрыццём у бок вуліцы ўнутрыквартальнай прасторы вельмі расшырае мастацкія магчымасці градабудаўніка, дапамагае яму надаць рознабаковую мастацкую характарыстыку вуліцам рознага прызначэння.

Яшчэ больш важную ролю, чым засваенне традыцый мінулага, мае праблема мастацкага ўвасаблення ўсяго таго новага, што ўносіць соцыялістычнае жыццё ў архітэктурную практыку. Стварэнне высотных будынкаў, архітэктура станцый маскоўскага метро, архітэктура Волга-Данскога канала, ансамбль вуліцы Крашчацік у горадзе Кіеве, праспект імя Сталіна ў Мінску, вуліца Міру ў Сталінградзе і рад другіх прыкладаў совецкага зодчества патрабуюць абагульнення і шырокага вывучэння. Работа совецкіх архітэктараў над пытаннямі архітэктурнага маштабу і сілуэта горада з'яўляецца адной з сур'ёзных і адказных задач, пастаўленых перад совецкім градабудаўніцтвам.

Зараз цэлыя кварталы, вуліцы і раёны забудоўваюцца жылымі дамамі. Ансамбль жылой вуліцы, квартала — гэта новая небывалая з'ява ў гісторыі архітэктуры. Натуральна, што пры такім шырокім маштабе будаўніцтва жылля пытанні тыпізацыі набываюць асаблівае значэнне. Толькі наяўнасць загадзя спраектаваных серый жылых дамоў можа паспяхова вырашаць пытанні жылога ансамбля. На жаль, да гэтага часу рад зацверджаных тыпавых серый па сваіх архітэктурных і планіровачных якасцях нездавальняючыя і ўстарэлыя.

Якасць гарадскога ансамбля, як вядома, залежыць не толькі ад архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў, але і ад мастацкага ўзроўню малых архітэктурных форм (фантаны, агарожы, свяцільнікі і зялёныя насаджэнні). Мармуравыя набераржныя Невы і каналаў, рашоткі Фельтэна і Вараніхіна, сады і паркі з'яўляюцца арганічнымі часткамі ленінградскіх ансамбляў і надаюць ім своеасаблівы мастацкі каларыт.

Уведзеная ў архітэктурны ансамбль манументальная скульптура ўзмацняе архітэктурную кампазіцыю, а таксама больш наглядна раскрывае ідэйную задуму. У асобных выпадках манументальная скульптура сама з'яўляецца носьбітам галоўнай, вядучай ідэі таго ці іншага ансамбля. Прыкладам гэтага могуць служыць манумент таварыша І. В. Сталіна на Цэнтральнай плошчы горада Мінска, а таксама помнік-манумент воінам Совецкай Арміі і партызанам на Круглай плошчы, якія самі з'яўляюцца вядучымі элементамі двух вялікіх архітэктурных ансамбляў горада. Шкада толькі, што ў нашай творчай практыцы вельмі часта праекты ансамбляў не распрацоўваюцца ў іх архітэктурнай і скульптурнай частцы адначасова. У выніку атрымоўваецца разнабой.

Зодчыя і скульптары павінны дзейнічаць узгоднена, асабліва калі значныя па свайму ідэйнаму зместу і буйныя па маштабах манументы вызначаюць новае аблічча плошчаў і магістраляў нашых гарадоў.

Створаная за гады пасляваеннага сталінскага пяцігадовага плана галоўная магістраль сталіцы Беларусі — праспект імя Сталіна з'яўляецца адным з яркіх прыкладаў комплекснага будаўніцтва архітэктурнага ансамбля, які ажыццяўляецца на аснове перадавых прынцыпаў совецкага градабудаўніцтва.

Аналагічны працэс адбываецца і ва ўсіх другіх гарадах Беларусі. Усюды разгарнуліся велізарныя градабудаўнічыя работы на новай аснове.

У Віцебску на аснове зацверджанага генеральнага плана распрацоўваецца цэнтр горада з усімі галоўнымі вуліцамі—Леніна, Кірава, Гогаля і інш.

Творчая ўвага віцебскіх архітэктараў накіравана на праектаванне вуліцы Кірава, якая злучае Прывакзальную плошчу з новай Цэнтральнай плошчай на левым беразе Заходняй Дзвіны. Пасярэдзіне вуліцы будзе разбіты бульвар шырынёю да 30 метраў. Актыўна забудоўваецца Комсамольская вуліца ў горадзе Гомелі. Зацверджаны праект вылучаецца сваёй рэальнасцю і ўмелым чаргаваннем грамадскіх і жылых пабудоў.

Асаблівую цікавасць у архітэктуры цэнтра Гомеля будзе ўяўляць архітэктурнае афармленне Совецкай плошчы, якая ўжо зараз мае з аднаго боку складаны помнік зодчества мінулага — былы палац Паскевіча і памяшканне драматычнага тэатра, якое занава будуецца.

Пачалася распрацоўка праектаў цэнтральных раёнаў з асноўнымі вуліцамі і плошчамі ў Магілёве, Бабруйску, Баранавічах.

У самы бліжэйшы час пачнуцца работы і ў другіх гарадах рэспублікі.

Стварэнне архітэктурнага ансамбля горада — не індывідуальнае майстэрства асобнага архітэктара, а творчасць вялікага калектыва. Без гэтага немагчымы сапраўдны росквіт мастацтва ансамбля.

Барацьба за ансамбль — барацьба за высокі ўзровень совецкай архітэктуры. Ансамбль з'яўляецца найбольш правільным шляхам у стварэнні стылю совецкай архітэктуры — архітэктуры Сталінскай эпохі.

Уручэнне ганаровых знакаў і дыпломаў лаўрэатам Сталінскай прэміі

За спектакль «Пяюць жаваранкі» ў Беларускім дзяржаўным драматычным тэатры імя Янкі Купалы прысуджана прэмія трэцяй ступені за 1951 год народнаму артысту Беларускай ССР У. Дзядзюшку, народнаму артысту СССР Б. Платонаву, народнаму артысту Беларускай ССР рэжысёру К. Саннікаву, заслужанай артыстцы Беларускай ССР В. Пола, артыстцы Л. Драздовай, народнай артыстцы Беларускай ССР Л. Ржэцкай.

Днямі адбылося ўрачыстае ўручэнне ганаровых знакаў і дыпломаў лаўрэата Сталінскай прэміі.

У зале тэатра імя Я. Купалы сабраўся ўвесь калектыў тэатра.

З прывітальнай прамовай выступіў старшыня Камітэта па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР П. Лютаровіч.

— Прысуджанне Сталінскіх прэмій групе артыстаў тэатра, — сказаў т. Лютаровіч, — павінна мабілізаваць увесь калектыў на новыя творчыя поспехі. Тэатр рыхтуецца цяпер да дэкады беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве. Увесь творчы калектыў павінен не пашкадаваць сваіх намаганняў, каб з чэсцю выканаць ускладзеныя партыяй і ўрадам задачы і правесці агляд у Маскве на высокім ідэйным і мастацкім узроўні.

Затым П. Лютаровіч уручыў ганаровыя знакі і дыпломы лаўрэата Сталінскай прэміі.

З прамовамі ў адказ выступілі У. Дзядзюшка, Л. Драздова і В. Пола.

— Мы горача дзякуем партыі, ураду і нашаму любімаму правадыру таварышу Сталіну, — сказаў У. Дзядзюшка, — за глыбокую ўвагу, за бацькоўскія клопаты. Мы будзем працаваць так, каб апраўдаць высокую ўзнагароду партыі і ўрада.

У Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР

Абмеркаванне часопіса „Беларусь“ № 9

На чарговым пасяджанні прэзідыума праўлення ССП БССР быў абмеркаваны часопіс «Беларусь» № 9. З дакладам выступіў В. Барысенка. Ён адзначыў, што ў часопісе змешчаны разнастайныя матэрыялы. Асабліва радуе той факт, што ў гэтым нумары шырока прадстаўлена крытыка — ад літаратуразнаўчых артыкулаў пра рускую, беларускую і румынскую літаратуры да рэцэнзій. Дакладчык лічыць добрымі артыкулы аб Радзішчаве — Э. Гурэвіч, пра румынскую літаратуру — В. Суганяй, а таксама вершы А. Бачылы і нарыс А. Белашэва.

К. Крапіва, В. Вітка, П. Кавалёў, А. Есакоў адзначылі, што хоць афармленне часопіса палепшылася і па свайму зместу часопіс стаў цікавейшым, аднак ён яшчэ не пазбавіўся некаторых істотных недахопаў. Асабліва крытыкаваўся артыкул В. Сасанові́ч «Рэволюцыйная дзейнасць Цёткі ў 1905 годзе», у якім пісьменніца беспадстаўна залічваецца ў марксісты, перабольшваецца рэволюцыйнае значэнне яе творчасці. Шмат цікавых думак, выказаных аўтарам аб Цётцы, не падмацаваны дакументамі і таму застаюцца галаслоўнымі. Да друкавання гісторыка-літаратурных матэрыялаў часопісу трэба падыходзіць больш сур'ёзна.

Слушныя заўвагі былі выказаны і ў адрас пісьменнікаў А. Васілевіч, І. Дуброўскага і А. Чарнышэвіча. Іх апавяданні, змешчаныя ў 9-м нумары, не вызначаюцца навізной. Мова твораў невыразная, вобразы раскрытыя нетлыбока, сюжэтныя сітуацыі не новыя.

У заключэнне выступіў рэдактар часопіса І. Гурскі, які згадзіўся з крытыкай, абяцаў улічыць недахопы і павысіць якасць часопіса.

Новыя вершы М. Танка

Вершы Максіма Танка, што перыядычна друкаваліся сёлета ў часопісе «Полымя», ахопліваюць вялікі круг тэм. Паэт жыве ў добрым творчым неспакоі, аб якім гаворыцца ў вершах «Паходная песня», «Мне спакою не зазнаць». Ён імкнецца адгукнуцца на ўсе значныя падзеі жыцця. Барацьба народаў за мір ва ўсім свеце, вялікая стваральная праца совецкіх людзей, будаўніцтва новага жыцця ў краінах народнай дэмакратыі — усё гэта тэмы новых вершаў М. Танка.

Нядаўна на секцыі паэзіі абмеркаванне новых вершаў паэта.

А. Вялюгін, адзначаючы тэматычную разнастайнасць вершаў М. Танка, падкрэсліў іх насычанасць адзіным палымяным пачуццём, іх натхнёнасць і актыўнасць. Мастацкі закончаныя і дзейсныя вершы «Выканана партыі заданне», «Сталінградскі музей», «Руская мова», «На Гіндукушы», «Блакітная рака», «Маці Нікаса Беляніса», «Антон Нябаба» і інш. з'яўляюцца добрым здабыткам паэзіі гэтага года. Гаворачы аб шырокім паэтычным погляде М. Танка, аб вялікім пачуцці інтэрнацыяналізма і шматграннасці яго паэзіі, ~~А. Кучар~~ адзначыў паасобныя паўтарэнні паэтам ужо сказанага ім у ранейшых вершах. А. Есакоў выказаў думку, што М. Танку больш удаюцца сюжэтныя і лірычныя вершы («Няма сцежкі карацейшай», «Не сумуй-жа, браце мой...», «Там, дзе вішанька»). Бессюжэтнасць адмоўна ўплывае на мастацкія якасці некаторых вершаў М. Танка. Гэтую думку падтрымаў А. Куляшоў і звярнуў увагу на паэтычную беднасць асобных публіцыстычных вершаў паэта і на неабходнасць выкарыстоўваць вялікі вопыт В. Маякоўскага ў гэтым жанры. А. Куляшоў адзначыў таксама аддаленае гучанне рыфм у некаторых строфах, не зусім удалую рытмічную арганізацыю ў паасобных вершах.

З асобнымі заўвагамі выступілі А. Астрэйка, К. Кірэенка, Д. Кавалёў.

Пасяджанне секцыі драматургаў

Секцыя драматургіі абмеркавала новую п'есу А. Маўзона «Калі разыходзяцца шляхі». Тэму для сваёй п'есы аўтар узяў з жыцця і працы беларускай тэхнічнай інтэлігенцыі. Канструктар станкабудаўнічага завода Галай працуе над новай маделлю складанага і вельмі важнага для прамысловасці станка. На шостым месяцы работы Галай сустрэўся з непераадольнай для яго цяжкасцю канструкцыйнага вырашэння аднаго з вузлоў станка. Гэтую акалічнасць скарыстаў галоўны канструктар завода Крыўцоў — даўні прыяцель Галая і яго сям'і. Крыўцоў піша ў міністэрства дакладную запіску аб немэтазгоднасці далейшай працы Галая над станком. Раней, чым паслаць дакладную, дырэктар завода Прахарчук і сакратар партарганізацыі Іванчанка паставілі яе на абмеркаванне тэхнічнага савета. І на совеце Крыўцоў здолеў давесці бесперспектыўнасць далейшай працы Галая над станком.

І толькі сваёй жонцы Наташы Крыўцоў прызнаўся, што ён знайшоў памылку Галая, але не сказаў яму пра яе. Крыўцоў паставіў сабе за мэту адхіліць праз міністэрства Галая ад работы над станком і самому закончыць станок, за які, як ён мяркуе, можа быць высокая ўрадавая ўзнагарода.

Наташа расказала аб гэтым Іванчанку і Прахарчуку, выкрыўшы тым самым сапраўдны твар кар'ерыста Крыўцова.

Такая ў асноўным галоўная сюжэтная лінія п'есы.

П'еса выклікала вельмі ажыўленае абмеркаванне, у якім прынялі ўдзел драматургі, крытыкі, артысты і рэжысёры.

Многія з выступаўшых (В. Вольскі, П. Кавалёў, А. Бучар, К. Губарэвіч, галоўны рэжысёр Рускага драматычнага тэатра БССР В. Фёдараў, дырэктар гэтага тэатра О. Гантман, артыст І. Ражба) прызналі, што ў п'есе ёсць правільная аснова, кампазіцыйная стройнасць, лагічная сюжэтная паслядоўнасць.

Разам з тым, аўтару было ўказана і на істотныя недахопы. Незразумела, напрыклад, чаму сакратар партарганізацыі Іванчанка ўхіліўся ад выступлення на тэхнічным совеце, калі ён даўно падазраваў нячыстыя намеры Крыўцова адносна Галая. Нельга таксама прызнаць пераканаўчай сюжэтную сітуацыю, калі Наташа, якой Крыўцоў выпадкова расказаў аб сваіх намерах, выкрывае яго.

У п'есе ёсць некаторыя вобразы без паўных драматургічных функцый. Мова большасці герояў не індывідуалізаваная.

Другая частка выступаўшых (Ул. Карпаў, А. Есакоў, А. Макаёнак, артысты Рускага тэатра Е. Палосін, Г. Качаткоў, С. Дубравін, М. Кузьменка) больш рэзка ацаніла п'есу. Ул. Карпаў лічыць, што канфлікт п'есы надуманы. Не можа быць такога становішча, каб грамадскасць не дапамагла Галаю вырашыць яго цяжкую творчую задачу і неверагодным здаецца, што Крыўцову да паўнага часу ўдавалася так лёгка ўводзіць у зман усю грамадскасць завода. Нельга паверыць і ў тое, сказаў Ул. Карпаў, што Крыўцову, які многа год сябраваў з Галаем, раптам захацелася скампраметаваць Галая і абкрасці яго. Празмерная просталінейнасць сюжэта не дала аўтару магчымасці ўзбагаціць п'есу цікавымі сцэнічнымі перыпетыямі.

З гэтымі думкамі Ул. Карпава згадзіліся Е. Палосін, Г. Качаткоў, С. Дубравін і другія. Яны дадалі яшчэ, што аўтар не стварыў яркія характары. Галай, напрыклад, вельмі шасіўны ў барацьбе з Крыўцовым. Таму больш правільным было-б, каб Галай змагаўся з Крыўцовым, а не наадварот.

А. Макаёнак налічыў некалькі эпізадычных герояў, якія пазбаўлены драматургічных функцый, што з'яўляецца сур'ёзным недахопам п'есы.

Дырэктар Рускага драматычнага тэатра О. Гантман і галоўны рэжысёр В. Фёдараў у сваіх выступленнях прызналі, што крытыка дапаможа тэатру і аўтару дапрацаваць п'есу, якую тэатр прыняў і ўключыў у свой рэпертуарны план.

Праграма народнага хора

Беларускі дзяржаўны народны хор паказаў грамадскасці Мінска сваю першую праграму. У паказе прынялі ўдзел мужчынская і жаночая групы, танцавальны калектыў, аркестр народных інструментаў, салісты-вакалісты і танцоры.

Былі выкананы беларускія народныя песні «А ў лесе на ляшчыне», «Ды ў зялёнай дуброве», сучасная народная песня «Як крыніца цячэ», песні прафесійных і самадзейных кампазітараў, аркестровая варыяцыя на беларускую народную тэму «Крыжачок», танцы «Смаленскі гусачок», «Лявоніха» і другія.

Адбылося шырокае абмеркаванне першай праграмы хора. Зроблены крытычныя заўвагі па рэпертуару і стылю выканання вакальных і танцавальных твораў.

Кампазітары і дзеячы беларускай музыкі выказалі агульную думку аб тым, што найбольш блізкімі да стылю народнага хора з'яўляюцца песні «Ды ў зялёнай дуброве», «А ў лесе на ляшчыне», якія вызначаюцца свежасцю мелодыі, яснасцю думкі. Сярод вакальна-харавых твораў прафесійных кампазітараў найбольш удалыя «Песня пра Сталіна» М. Аладава (на словы А. Русака), «Узнялося сонца яснае» Д. Лукаса (тэкст А. Русака) — аб будаўніках электрастанцыі «Дружба народаў».

Аднак многае яшчэ не задавальняе ў рэпертуары хора. Не знойдзены належны стыль для выканання розных па жанру твораў. Не на аднолькавым узроўні знаходзяцца мастацкія калектывы і салісты.

Р. Пукст заўважыў, што ў рэпертуары хора мала твораў на тэмы нашай сучаснасці, асабліва з жыцця беларускага народа. Адчуваецца інтэрнацыйная аднастайнасць песень, занадта шмат адхіленняў у мінорны трафарэт. Патрэбна большае жанравае багацце рэпертуара, неабходна ўзбагаціць яго лірычнымі і задорна-камедыйнымі песнямі.

Частушкі на калгасныя тэмы крытыкаваў за прымітыўнасць хормайстар Н. Маслаў.

Удзельнікі абмеркавання адзначылі, што ў хоры яшчэ няма яркіх твораў для паказу на дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве.

Б. Афанасьеў, М. Маслаў і Н. Салабуцін падрабязна спыніліся на майстэрстве новага калектыва. Было адзначана, што манера выканання харавых і танцавальных твораў яшчэ блізкая да ансамбля песні і танца, часам нават да эстрады, што не адпавядае кірунку народнага хора. Артысты часта спяваюць нястройна, у іх невыразная дыкцыя, не пастаўлена дыханне. Група сапрана слабейшая за мецасапрана. Адчуваецца паўны стылістычны разнабой паміж харыстамі — былымі ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці і выхаванцамі музычных навучальных устаноў. Аркестр часта заглушае спевакоў. У ім надзвычай слабая цымбальная група. Увогуле аркестр не павінен выступаць з самастойнай канцэртнай праграмай, а толькі ў ансамблі з усім калектывам.

Сур'ёзна крытыкавалася выступленне танцавальнай групы (кіраўнік тав. Гаўрылаў), для якой яшчэ не знойдзены сучасны рэпертуар і ўласны стыль выканання. «Смаленскі гусачок» занадта расцягнены і перагружаны, а «Лявоніха» выконваецца без арганічнай увязкі з песняй «Вішанька», якая папярэднічае танцу. Пастаноўшчык танцаў, відаць, яшчэ не зусім уяўляе сабе ролю калектыва, якім ён кіруе.

Слушныя парады аб палепшанні рэпертуара і павышэнні майстэрства хора зрабілі кампазітары Я. Цікоцкі, М. Аладаў, П. Падкавыраў, С. Трафімаў, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага хора Р. Шырма.

Старшыня Камітэта па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР П. Лютаровіч і намеснік старшыні камітэта Я. Парватаў падкрэслілі неабходнасць больш выразна вызначыць творчы профіль народнага хора, узбагаціць яго рэпертуар сучаснымі песнямі і танцамі. Яны заклікалі беларускіх кампазітараў стварыць для новага калектыва добрыя песні і танцавальную музыку.

Прэм'ера ў тэатры імя Я. Коласа

Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа падрыхтаваў для паказу на дэкадзе ў Маскве новы спектакль па п'есе М. Горкага «Ворагі».

Гэтымі днямі тэатр паказаў прэм'еру спектакля гледачам Гомеля.

Пастаноўка спектакля ажыццёўлена рэжысёрам МХАТ'а імя М. Горкага заслужаным артыстам РСФСР І. Раеўскім. Афармленне — заслужанага дзеяча мастацтва РСФСР В. Рындзіна.

Ролі выконваюць артысты А. Ільінскі, Ц. Сяргейчык, М. Звездачотаў, А. Шэлег, Е. Радзялоўская, М. Бялінская, Н. Глебаўская, А. Трус, Ф. Шмакаў, С. Скальскі, Е. Разанава, С. Казлоў, Н. Ерэменка, І. Матусевіч і другія.

Спектакль цёпла сустрэты грамадскасцю Гомеля.

Канферэнцыя па кнізе „Людзі асобага складу“

У клубе Мінскага вагонарамонтнага завода імя Мяснікова адбылася канферэнцыя чытачоў па кнізе Героя Совецкага Саюза Б. І. Казлова «Людзі асобага складу».

Свае ўражанні і заўвагі па кнізе выказалі столяр А. Валадковіч, брыгадзір малярных работ А. Хазанава, выхавацель моладзі завода Н. Латышаў, сібліятэкар Т. Масаніна.

Аўтар літаратурнага запісу Аляксей Кулакоўскі расказаў прысутным аб тым, як ствараласа кніга.

Дружба па-амерыканску

Праводзячы імперыялістычную палітыку ў адносінах да Англіі, Францыі і іншых капіталістычных краін. Злучаныя Штаты Амерыкі маюць да таго-ж, мякка кажучы, нескромнасць выдаваць сябе за шчырага друга гэтых краін. Добры друг! Усеўся вярхом на сваіх малодшых партнёраў, грабіць і закабаляе іх, лупіць у хвост і ў грыву, ды яшчэ прыгаварвае: «падружымся», што ў амерыканскіх таўстасумаў азначае — перш вы мяне павозіце, потым я на вас паезджу.

(Са справаздачнага даклада Г. М. Маленкова — XIX з'езду ВКП(б).

Спрытны янкі уссеў на кабылу,
Закілзаў яе й ну — бізуном,
Падсыпае і ў хвост, і у грыву:
— Варушыся, лядашчая! Н-но!

Але нельга прыбавіць ёй сілы
Ні нагайкай, ні «шчодрай» рукой:
Ненадзейная гэта кабыла,
Не далёка заедзеш на ёй.

Ул. КОРБАН.

Малюнак В. Ціхановіча.

ФЕЛЬЕТОН

„Творчае натхненне“ Івана Дземідзенкі

Рэдакцыйная «лятучка» ў навагрудскай гарадской газеце «Звязда» зацягнулася. Адказны сакратар рэдакцыі Іван Паўлавіч Дземідзенка ўсё ніяк не мог закончыць сваю гарачую прамову. Шырокімі мазкамі маляваў ён перад супрацоўнікамі маральнае аблічча совецкага журналіста, гаварыў пра чэснасць, добрасумленнасць, творчы падыход да справы.

Супрацоўнікі нецярпліва паглядалі на гадзіннік, сарамліва пазяхалі ў далоні, наогул давалі зразумець, што час-бы і канчаць прамову. Аднак спыніць прамоўцу ніхто не адважваўся. Лятучка працягвалася.

Пакуль Іван Паўлавіч вымаўляе высокія словы, пазнаёміся бліжэй з яго справамі.

Творчае натхненне — галоўны ўзбуджальны імпульс у рабоце Івана Паўлавіча. Адзін з яго матэрыялаў, які ён змясціў на старонках баранавіцкай абласной газеты «Чырвоная звязда» ад 13 верасня г. г., так і называецца — «Творчае натхненне».

На гэты раз, праўда, размова ішла не аб творчым натхненні Івана Паўлавіча, а аб працоўных справах работнікаў Навагрудскага лесгаса. Натхненне-ж самога аўтара выразна бачна, калі параўнаць нумар баранавіцкай газеты ад 13 верасня з нумарам навагрудскай газеты ад 7 верасня. Тут таксама змешчана заметка пад назвай «Творчае натхненне» за подпісам І. Дзям'янава. І вось якая карціна ўзнікае перад намі з гэтага параўнання.

Навагрудская «Звязда»:

Ініцыятарам спаборніцтва ў чэсць з'езда выступіў калектыў брыгады па вырабу кровельных матэрыялаў, якую ўзначальвае Васілій Касцюк. Рабочыя брыгады ўзялі абавязацельствы да знамянальнай даты — дня адкрыцця XIX з'езда — выканаць гадавы вытворчы план і сэканоміць 30 кубаметраў драўніны. І г. д.

Баранавіцкая «Чырвоная звязда»:

Ініцыятарам спаборніцтва ў чэсць з'езда выступіла брыгада па вырабу кровельных матэрыялаў, якой кіруе Васіль Касцюк. Рабочыя ўзялі на сябе абавязацельства да дня адкрыцця з'езда выканаць гадавы вытворчы план і сэканоміць не менш 30 кубаметраў высокаякаснай драўніны. І г. д.

Падобных параўнанняў можна зрабіць нямала. Параўнаем, напрыклад, заметку І. Дземідзенкі «Адпачынак школьнікаў» у баранавіцкай абласной газеце ад 30 чэрвеня 1952 года з заметкай І. Паўлава «Школьнікі адпачываюць», якая змешчана ў навагрудскай гарадской газеце ад 16 чэрвеня 1952 года.

Навагрудская «Звязда»:

Аб здаровым адпачынку юных ленінцаў вялікія клопаты праяўляюць іх старэйшыя таварышы — комсамольцы. Па ініцыятыве райкома комсамола арганізаваны гарадскі піонерскі лагер. Тут праводзіць лета 100 піонераў школ раёна.

Баранавіцкая «Чырвоная звязда»

Аб здаровым адпачынку юных ленінцаў вялікія клопаты праяўляюць іх старэйшыя таварышы — комсамольцы. Па ініцыятыве райкома комсамола арганізаваны гарадскі піонерскі лагер. Тут праводзіць лета 100 школьнікаў раёна.

Чытач ужо здагадваецца, што аўтарам усіх гэтых заметак з'яўляецца адказны сакратар навагрудскай гарадской газеты. У нумары навагрудскай газеты «Звязда» ад 4 чэрвеня т. г. змешчаны артыкул загадчыка парткабінета Навагрудскага РК КП(б)Б т. В. Іванова «Палітычныя даклады для насельніцтва». Параўнаем ўжо артыкул з заметкай І. Дземідзенкі, якая змешчана ў рэспубліканскай газеце «Калгасная праўда» 22 чэрвеня пад назвай «Палітычныя даклады сярод калгаснікаў».

У артыкуле т. Іванова гаворыцца:

«Рэгулярна выступаюць з дакладамі перад насельніцтвам тт. Сянькевіч, Цярэшчанка, Кірэйчук, Сабіла, Монасаў, Бражынскі, Іпатаў і другія. Гэтыя дакладчыкі старанна рыхтуюцца да кожнага даклада, выязджаюць у калгас за два-тры дні да яго чыткі. Там яны знаёмяцца са становішчам спраў і ўвязваюць гэта з тэмай свайго даклада».

У заметцы І. Дземідзенкі чытаем:

«Рэгулярна два-тры разы ў месяц выступаюць перад насельніцтвам пазаштатныя дакладчыкі тт.: Сянькевіч, Цярэшчанка, Кірэйчук, Сабіла, Монасаў, Бражынскі, Іпатаў. Гэтыя таварышы старанна рыхтуюцца да кожнага даклада, выязджаюць у калгасы за два-тры дні да свайго выступлення. На месцы яны знаёмяцца са становішчам спраў у калгасах, аказваюць непасрэдную дапамогу праўленням арцелей і пярвічных партарганізацый у ліквідацыі выяўленых недахопаў».

Можна-б прывесці яшчэ нямала падобных прыкладаў «творчасці» І. Дземідзенкі.

Дзіўна, што ні ў каго з работнікаў рэдакцыі нестае смеласці перапыніць «дзейнасць» Івана Паўлавіча і сказаць яму:

— Шаноўны Іван Паўлавіч, убаўце «творчае натхненне», вельмі-ж дзёка яно завяло вас!

Н. ХАРЫТОНАЎ.
А. ПАДОЛЬСКІ

Пісьмы ў рэдакцыю

Неахайныя ілюстрацыі

Малюнкі да апавяданняў у ілюстраваным часопісе дапамагаюць ярчэй і паўней уявіць мастацкі твор. Аднак малюнкі для часопіса «Беларусь» часта выконваюцца дрэнна, без належнага ўсведамлення адказнасці перад чытачом. У гэтым лёгка пераканацца, калі паглядзець некаторыя нумары часопіса за гэты год.

У другім нумары да апавядання «Бярозавы партабак» І. Дуброўскага ёсць толькі адзін малюнак (мастак С. Раманаў), ды і той невыразны, бледны. У ім не перадаецца атмасфера напружанай натхнёнай працы на дрэваапрацоўчым заводзе. Невыразным з'яўляецца і малюнак Ю. Пучынскага да апавядання «Стэфа Ванчэк» М. Брандыса ў пятым нумары часопіса. Рысы твораў у намаляваных герояў апавядання неадухоўлены, у іх не адчуваецца багатага ўнутранага свету герояў.

У сёмым нумары часопіса адзін малюнак С. Раманава да апавядання «Сустрэча» А. Міронава зусім не адпавядае тэксту. У творы гаворыцца: «За дзвярыма, усе яшчэ трымаючы палец на кнопцы званка, стаяў высокі, тоўсты-тоўсты чалавек у марской шапцы, у шэрым макінтошы, з люлькай у зубах і з жоўтым скураным чамаданам у левай руцэ». Мастаку чамусьці не спадабалася такая поза тоўстага чалавека, і на малюнку ён трымае чамадан ужо ў правай руцэ, а на кнопцы званка — палец левай рукі. Чым выклікана такая перамена? Невядома.

Падобная неадпаведнасць ёсць і ў восьмым нумары часопіса, дзе змешчаны малюнкі В. Басава да апавядання Міколы Ракітнага «Яблыкі».

Мастакі, а таксама рэдакцыя часопіса павінны праяўляць больш патрабавальнасці да якасці ілюстрацый.

В. КАВАЛЕНКА,
студэнт Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага.

Стварыць умовы для работы хора

Вельмі неахвотна ідуць зараз на рэпетыцыі ўдзельнікі Азяршчынскага хора. І не дзіўна: нікому няма ахвоты ісці ў халодны, няўтульны і непрыстасаваны для заняткаў клуб. А што будзе, калі надыйдзе зіма? Пажарная камісія забараніла паліць печы, дровы не нарыхтаваны.

Яшчэ ў 1951 годзе пачаўся рамонт клуба, але да гэтага часу не скончаны. Між тым, такое становішча, відаць, нікольки не турбуе Рэчыцкі райкультасветаддзел. Яго загадчык тав. Бабін прымірыўся з усім гэтым. Наогул, адносіны тав. Бабіна да хора не могуць не выклікаць па меншай меры здзіўлення, калі не абурэння.

Хор пад кіраўніцтвам Т. Лапацінай — жаданы госць ва ўсіх суседніх калгасах і сельсоветах. Тым не менш, калектыў яго рэдка мае магчымасць выехаць куды-небудзь, бо машына райкультасветаддзела абслугоўвае ў асноўным асабістыя патрэбы тав. Бабіна.

«Норавы» тав. Бабіна з «поспехам» перанёс і дырэктар Рэчыцкага раённага Дома культуры тав. Аўсяннік, які таксама зусім не цікавіцца работай хора.

Прадастаўлены самому сабе, хор працуе ніжэй сваіх магчымасцей, а ў дні падрыхтоўкі да дэкады гэта тым больш недапушчальна.

О. КУЛЯШОВА,
дырэктар Гомельскага абласнога Дома народнай творчасці.

НОВЫЯ КНІГІ

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі:

В. Маякоўскі. Выбраныя творы. Пераклад з рускай мовы пад рэдакцыяй А. Куляшова. Уступны артыкул В. Бурносава. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 376. Цана 7 руб. 20 кап.

І. Шамякін. Глыбокая плынь. Раман. Рэдактар М. Лынькоў. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 535. Цана 10 руб. 80 кап.

І. Грамовіч. Да ясных вышынь. Апавяданні. Рэдактар Я. Брыль. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 276. Цана 6 руб. 70 кап.

Цётка. Выбраныя творы. Прадмова М. Клімковіча. Рэдактар Г. Ананіч. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 148. Цана 4 руб. 55 кап.

Я. Брыль. Дзеля сапраўднай радасці. Рэдактар Ул. Карпаў. Мастак В. Мурашоў. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 376. Цана 8 руб.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Аляксей КУЛАКОЎСКІ, Пімен ПАНЧАНКА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Праспект імя Сталіна, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 76290. Друкарня «Чырвоны друкар», г. Мінск, Рэволюцыйная 12.